# ПА БССР

## МЕНСК ПЕРАД ЛЕНІНСКІМІ ДНЯМІ

### НОВЫЯ КНІГІ, ВЫСТАЎКІ

* Акадэмія Навук Беларусі падрыхтавала зборнік навуковых работ, прысвечаных Леніну. Сярод гэтых работ «Ленін і крызіс сучаснага прыродазнаўства»; «Ленін і барацьба з рэлігіяй»; «Ленін і ўсеагульны крызіс капіталізма»; «Практычнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР»; «Ленін і тарфяная справа»; «Ленін і пролетарскі інтэрнацыяналізм».

У інстытутах акадэміі адбудуцца навуковыя даклады аб Леніне і яго ролі ў развіцці розных галін навукі. Навуковыя працаўнікі акадэміі выступяць таксама з дакладамі аб Леніне на прадпрыемствах Менска.

* Да 10-годдзя з дня смерці В. І. Леніна партвыдат БССР выдае рад брашур класікаў марксізма-ленінізма. На працягу бягучага месяца вый дзе з друку 17 брашур Леніна. Сярод іх «Пісьмы здалёку»; «Крах ІІ Інтэрнацыянала»; «Аб задачах моладзі»; «Ваенная праграма пролетарскай рэволюцыі» і інш.

У лютым выйдзе з друку І том выбраных твораў Леніна (двухтомніка), падрыхтоўваецца таксама двухтомнік твораў Маркса.

* Беларускі радыёкамітэт 22 студзеня перадаюць па радыё новую сімфонію кампазітара Аладава «Сільней смерці», прысвечаную Леніну.

Апроч таго падрыхтаван рад вакальных харавых твораў на беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай мовах.

Літаратурна - драматычны аддзел радыёкамітэта ў ленінскія дні рыхтуе літаратурна-музыкальны мантаж «10 год без Леніна», літаратурна-мастацкую перадачу «Ідзем дарогай Ільіча», радыё-п'есу «Пад сцягам Леніна» і літаратурна-музычны плакат «Наш кожны крок па-ленінску разлічан».

* Дзяржаўная бібліятэка арганізуе выстаўку «10 год без Леніна па ленінскаму шляху». Складзен спіс рэкамендацыйнай літаратуры для бібліятэчнай сеткі БССР. Напярэдадні ленінскіх дзён у бібліятэцы будзе давацца кансультацыя для бібліятэчных работнікаў Менска.